# Ж

**Ж**, восьмая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай Ж(«жывеце»), якая была ўтворана шляхам далучэння цэнтр. вертыкальнай рыскі да літары Х («хер») або падвання літары З («зямля»). У старабел. графіку перайшла са старажытнарус. пісьменства. Абазначала зычны гук [ж], пры аглушэнні [ш] («жыто», «нош»). Лічбавага значэння не мела. У 16 ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумны звонкі зацвярдзелы шчылінны пярэднеязычны зычны гук «ж» («жыта», «лыжы»), а перад глухімі зычнымі і на канцы слоў — парны да яго па звонкасці і глухасці гук «ш» («дарошка»). Уваходзіць у склад дыграфа «дж» («дажджы»). Пры класіфікацыйным падзеле мае значэнне «восьмы» (група «ж»), пры лічбавай нумарацыі — дадатковае значэнне для размежавання прадметаў пад адным нумарам.

**ЖА́БА**, фальклорны хтанічны персанаж, які мае сувязь з навальніцай, нізам, балотам, рэдкай граззю, вільготнай рыхлай зямлёй і г.д. Паводле міфалогіі, зямля знаходзіцца на вадзе або на хтанічных жывёлах, у т.л. на Ж. Ведзьмакі або заклятыя людзі ператвараюцца ў Ж., якіх называюць рапухамі. Для беларусаў з даўніх часоў Ж.-рапуха — гэта вядзьмарка-чарадзейка, якая выклікала хваробы ў жывёл і людзей, напр. Ж. грудную, брушную, цялячую, крыжападобную. Паводле ўяўленняў, каб пазбегнуць гэтых захворванняў, трэба зняць і спаліць скуру злоўленай Ж. Ва ўсіх ператварэннях Ж. мае значэнне яе скура. Напр., у казачным сюжэце паленне скуры вызваляе царэўну-Ж. ад праклёну. Зрэдку ў казках Ж. дапамагае чалавеку: паказвае шлях герою, пераносіць яго цераз раку, дае карысную параду. У нар. побыце яе сувязь з жанчынай выяўляецца ў параўнанні «Баба як жаба» або ў назве злой жанчыны «Ж.». Беларусы верылі, што калі на Раство ў хату першай прыйдзе жанчына, то ўвесь год у ёй будуць Ж. На Віцебшчыне, калі выцягвалі ў сетцы замест рыбы Ж., меркавалі, што праз яе пераступіла «нячыстая» жанчына. Пра адносіны продкаў да Ж. сведчаць нар. прыказкі і прымаўкі: «Жаба малая, а горла вялікае», «Кожная жаба сябе хваліць», «Не лезь, жаба, туды, дзе коней куюць».

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Жыцця адвечны лад. Мінск, 1999. *А.М.Аляхновіч.*

**ЖА́БА** Ігнацы (16.8.1713 — 17.9.1780), рэлігійны і грамадскі дзеяч ВКЛ, тэолаг, педагог. Канонік смаленскі. Вучыўся ў Гродзенскім езуіцкім калегіуме. У 1729 уступіў у ордэн езуітаў. Вывучаў філасофію ў Віленскай акадэміі (1731—34), тэалогію ў Варшаўскай тэалагічнай студыі. Настаўнічала ў Ломжы (з 1735), Полацку (1736—37), Вільні (1742—43), Мінску (з 1747) і Нясвіжы (з 1749). З 1752 пракуратар і прэфект будаўніцтва ў Полацку. З 1753 праф. тэалогіі Віленскай акадэміі. З 1754 пракуратар Літоўскай правінцыі, з 1756 прадстаўніцтва Рэчы Паспалітай пры генеральнай курыі ордэна езуітаў у Рыме. У 1760—63 і 1774—79 рэктар Віленскай акадэміі. Узначальваў калегіумы ў Гродне (з 1763), Жодзішках (з 1766), Браневе (з 1769). У 1773 кіраўнік езуіцкай рэзідэнцыі ў Мітаве (Елгаве). *А.Ф.Самусік.*

**ЖА́БЕРСКІ ЗА́МАК**. Існаваў у 17 — пач. 18 ст. Размяшчаўся за 3 км на ПнЗ ад в. Жабер Драгічынскага р-на, на правым беразе р. Ясельда. Належаў князям Вішнявецкім. Прамавугольнае ў плане ўмацаванне было абкружана з 3 бакоў вадзяным ровам (шыр. да 20 м, глыб. 5 м), з 3 — ракой, умацавана высокім земляным валам з бастыёнамі на вуглах (пл. каля 1,5 га) і дубовым частаколам. З наваколлем замак злучаўся брамай і мостам. Разбураны ў час Паўн. вайны 1700—21. Збярогся падмурак брамы.

**ЖА́БІНКА**, горад у Брэсцкай вобл., цэнтр Жабінкаўскага р-на, пры ўпадзенні р. Жабінка ў р. Мухавец. За 30 км на ПнУ ад Брэста, чыг. вузел